Цуд у Любчы! Ажыўляючы веру, уваскрашаючы гісторыю

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
30.06.2019 00:00



Невялічкі гарадскі пасёлак Любча, што пад Навагрудкам, які не налічвае нават 1500 жыхароў і мае ў 10 разоў менш католікаў, здаўна хавае ў сабе велізарную хрысціянскую каштоўнасць. Менавіта адсюль пачала распаўсюджвацца вера ў Езуса на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага. Тут быў пабудаваны першы каталіцкі храм і заснавана першае лацінскае біскупства на нашых землях. Ад хаты да храма

Парафіяльная супольнасць з’явілася ў Любчы ў XIII стагоддзі. Вакол яшчэ панавала язычніцтва, а вызнаўцы Хрыста ўжо збіраліся на набажэнствы ў касцёле, які ўзвышаўся леваруч ад Любчанскага замка. Дарэчы, там быў каранаваны Міндоўг – першы вялікі князь літоўскі. Палац захаваўся дагэтуль, а святыня адышла ў нябыт – была спалена падчас Трынаццацігадовай вайны (1654–1667 гг.).

З тых часоў у любчанскай каталіцкай супольнасці распачаўся складаны перыяд блуканняў, які, можна сказаць, завяршыўся толькі 30 чэрвеня бягучага года. † У гэты дзень у Любчы асвяцілі новую святыню. Яна “выросла” за няпоўныя 2 гады дзякуючы тытанічным намаганням пробашча навагрудскай парафіі кс. Юрыя Жэгарына і тутэйшых вернікаў.

Цуд у Любчы! Ажыўляючы веру, уваскрашаючы гісторыю

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
30.06.2019 00:00





